Карнейчык Лілія Уладзіміраўна

АПІСАННЕ ВОПЫТУ ПЕДАГАГІЧНАЙ ДЗЕЙНАСЦІ

ФАРМІРАВАННЕ НАЦЫЯНАЛЬНАЙ СВЯДОМАСЦІ ЯК НЕАД'ЕМНАЙ ЧАСТКІ ГРАМАДЗЯНСКАСЦІ І ПАТРЫЯТЫЗМУ Ў НАВУЧЭНЦАЎ КАЛЕДЖА Ў ПРАЦЭСЕ РАБОТЫ КЛУБА «НАШЧАДКІ»

Установа адукацыі

«Жыровіцкі дзяржаўны аграрна-тэхнічны каледж»

тэл./факс 8(01562)96-2-33

e-mail: kvasil@tut.by

2017 г.

I. Інфармацыйны блок

Назва тэмы вопыту

Фарміраванне нацыянальнай свядомасці як неад'емнай часткі грамадзянскасці і патрыятызму ў навучэнцаў каледжа ў працэсе работы клуба "Нашчадкі".

Актуальнасць тэмы

У апошнія гады актуальным стала пытанне аб фарміраванні нацыянальнай свядомасці ў працэсе адукацыі і выхавання навучэнцаў. Прыкметна ўзрасла і цікавасць навукоўцаў і педагогаў да праблемы патрыятычнага выхавання. Гэта відаць па шматлікіх публікацыях у прэсе і з'яўленню дакументаў на дзяржаўным узроўні.

Гэты факт азначае, што праблема фарміравання пачуцця патрыятызму ў грамадзян Рэспублікі Беларусь пасля яе прававога замацавання набыла статус дзяржаўнай задачы.

Вялікі патрыятызм пачынаецца з маленькага – з любові да таго месца, дзе жывеш. Ведаць сваю нацыянальную народную творчасць, родную мову, гісторыю і культуру – гэта значыць не парываць з вытокамі сваёй Айчыны, свайго народа. Палітычныя і сацыяльна-эканамічныя змены, якія адбываюцца ў грамадстве, аказалі сур'ёзны ўплыў на ўсе сферы жыцця і дзейнасці людзей.

Сёння, на мяжы XXI стагоддзя, назіраецца збядненне духоўнага свету падрастаючага пакалення, перанасычэнне яго свядомасці інфармацыяй з розных сродкаў масавай інфармацыі: інтэрнэт, відэа і аўдыёпрадукцыя, спутнікавае тэлебачанне. Моладзь і падлеткі страчваюць сувязь з культурнай спадчынай народа. Сфарміраваліся новыя ўстаноўкі і каштоўнасці, з'явіліся новыя крытэрыі ацэнкі тых ці іншых з'яў, фактаў, працэсаў. Гэта прывяло да змянення каштоўнасных арыенціраў моладзі.

Як змяніць сітуацыю? Як выхаваць духоўна багатую і ўсебакова развітую асобу, сэнс жыцця якой быў бы цесна звязаны з лёсам народа, краіны? Якія прынцыпы і тэхналогіі для гэтага выкарыстаць? Такія пытанні хвалююць кожнага педагога сучаснай школы.

Таму ўзнікла неабходнасць мэтанакіраванай працы па фарміраванні ў навучэнцаў каледжа погляду на нацыянальную культуру як на фундаментальную духоўную каштоўнасць народа. Бо толькі той чалавек, які засвоіў культурныя каштоўнасці свайго народа, зможа актыўна ўплываць на жыццёвыя абставіны і аналізаваць стваральную дзейнасць людзей.

Такім чынам, каб пераадолець сацыяльную абыякавасць, выхаваць у навучэнцаў каледжа пачуццё патрыятызму, любоў да Радзімы, грамадзянскую адказнасць за дзяржаву, каб вырасціць грамадзян, якія неабыякавыя да лёсу свайго народа, нам, настаўнікам, па-першае, трэба памятаць пра неабходнасць і першачарговую важнасць арганізацыі грамадзянска-патрыятычнага выхавання; па-другое, стварыць канкрэтныя ўмовы, пры якіх яно будзе магчыма.

Кожны павінен любіць тое месца, дзе нарадзіўся, дзе жыве. І любоў да родных мясцін пачынаецца з маленства. Вядома, што ўключэнне асобы ў грамадства павінна суправаджацца адукацыйна – выхаваўчым працэсам на працягу ўсяго перыяду навучання і асабліва на апошнім яго этапе, калі ў свядомасці навучэнцаў адбываецца завяршаючы працэс фарміравання жыццёвых арыенціраў і маральных каштоўнасцей. Менавіта тады ў юных грамадзян краіны закладваюцца асновы патрыятызму і грамадзянскасці. Таму так важна не прапусціць гэты момант і выхаваць з падрастаючага пакалення сапраўдных патрыётаў сваёй краіны, якія б пачалі адчуваць сябе неад'емнай часткай Бацькаўшчыны.

Велізарныя магчымасці ў вырашэнні дадзенага пытання могуць быць рэалізаваны праз дзейнасць прадметнага клуба. У працэсе клубнай работы навучэнцы маюць большую магчымасць, чым на ўроку, судакрануцца з прадметамі – праўдзівымі сведкамі культурнай спадчыны народа. Гэта забяспечвае высокую эмацыянальнасць успрымання матэрыялу, доказнасць пры яго выкладанні, што робіць вучэбна-выхаваўчы працэс больш дзейсным. Менавіта клубная дзейнасць у цеснай сувязі з прадметам " Беларуская літаратура" з'яўляюцца эфектыўнымі сродкамі фарміравання нацыянальнай свядомасці навучэнцаў.

Адным з асноўных накірункаў выхаваўчай работы ва ўстановах адукацыі з'яўляецца " фарміраванне духоўна і маральна сталай творчай асобы на аснове нацыянальных і агульначалавечых каштоўнасцей; выхаванне грамадзяніна і патрыёта; выхаванне павагі да сябе, іншых людзей, да сям'і, традыцый і звычаяў беларускага народа…" [1, арт 39].

Актуальнасць дадзенай работы і ў тым, што, на жаль, традыцыі

савецкага часу характарызуюцца пераважна ваенна-гістарычнай накіраванасцю і недастатковай увагай да сацыякультурнай часткі грамадзянскай самасвядомасці.

За час існавання патрыятычнага клуба «Нашчадкі» яго членамі сабрана вялікая колькасць экспанатаў для этнаграфічнага музея калежа, праведзена цэлы шэраг адкрытых паседжанняў , рапрацавана шмат матэрыялаў па гісторыі і культуры Слонімшчыны, іншых куткоў нашай Беларусі, якія могуць быць выкарыстаны настаўнікамі беларускай літаратуры, а таксама класнымі кіраўнікамі пры правядзенні тэматычных гадзін.

Мэта вопыту - выкарыстоўваючы багаты этнакультурны матэрыял, садзейнічаць фарміраванню ў навучэнцаў нацыянальнай свядомасці, пачуцця любові да Радзімы, пачуцця павагі да сваіх нацыянальных каранёў.

Аб'ектам педагагічнага даследавання з'яўляецца грамадзянска-патрыятычнае выхаванне навучэнцаў каледжа праз клубную дзейнасць.

Прадметам даследавання з'яўляецца сістэма арганізацыі клубнай дзейнасці па фарміраванні нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў ва ўстанове адукацыі " Жыровіцкі аграрна-тэхнічны каледж".

Задачы вопыту:

- Усебаковае і комплекснае вывучэнне сваёй нацыянальнай спадчыны;
- Фарміраванне ў навучэнцаў духоўнай культуры на аснове нацыянальных каштоўнасцей беларускага народа;
- Выхаванне любові да Радзімы;
- Развіццё псіха- эмацыянальнай сферы асобы навучэнцаў, іх эстэтычнага густу;
- Развіццё інтэлектуальных здольнасцей навучэнцаў;
-Фарміраванне культуралагічнай кампетэнцыі навучэнцаў;
-Развіццё камунікатыўнай кампетэнцыі навучэнцаў;
- Фарміраванне ў навучэнцаў літаратурна- творчых уменняў і навыкаў.

Асноўны змест вопыту: абагульненне вопыту аўтара па фарміраванню нацыянальнай свядомасці навучэнцаў каледжа праз клубную дзейнасць.

.

Навукова-метадычнае абгрунтаванне

1.Тэарэтычныя асновы вопыту.

У педагагічнай літаратуры **самасвядомасць** азначаецца як дакладнае разуменне сваёй сутнасці, сваіх адметных рыс, сваёй ролі ў навакольным асяроддзі; **грамадзянін** як свядомы член грамадства, чалавек, які падпарадкоўвае свае асабістыя інтарэсы грамадскім.

Пад нацыянальнай свядомасцю разумеюць усведамленне супольнасцю сваіх інтарэсаў, запатрабаванняў. Наяўнасць цэласнай ацэнкі характара сваёй жыццядзейнасці, свайго пачуцця всетаўспрымання сістэмы сваіх ідэалаў.

Структура нацыянальнай свядомасці ўключае пазнавальны, дзейна-валевы і эмацыянальны элементы, ахоплівае пачуццёвае, рацыянальнае і дзейснае адлюстраванне рэчаіснасці. У яе ўключаецца таксама памяць, воля і чалавечыя эмоцыі. Вытокі гэтых элементаў – у далёкім мінулым. Яны ўзнікаюць і развіваюцца пад уздзеяннем жыцця, гістарычных падзей, творчай думкі знакамітых прадстаўнікоў нацыі.

Выдзяляюць наступныя кампаненты ў структуры нацыянальнай свядомасці: культуралагічны, афектыўны, кагнітыўны.

Культуралагічны кампанент з’яўляецца асновай нацыянальнай самасвядомасці асобы: ён уключае ўсё тое, што складае змест нацыянальнай культуры і гісторыі народа. Ён аб’ядноўвае практычна ўсе ўяўлені чалавека аб сваёй нацыі: гісторыка-геаграфічныя, моўныя, культурныя, этычныя, абрада-бытавыя і г. д.

Афектыўны кампанент – гэта эмацыянальна-пачуццёвая сфера нацыянальнай самасвядомасці, якая звязана з усведамленнем асобай сваіх адносін да культурнай спадчыны свайго народа, што дазваляе ідэнціфіцыраваць сябе як прадстаўніка нацыі і вызначыцца ў сваёй ментальнасці. Напрыклад, да агульных рыс менталітэту беларусаў можна аднесці талерантнасць, добразычлівасць,кемлівасць, паэтычнасць душы і многа іншых прывабных якасцей. У адпаведнасці з агульнымі назіраннямі, беларусам ва ўсе часы была ўласціва павага да іншых народаў і дабразычлівасць да тых, хто думае інакш.

Кагнітыўны кампанент – гэта псіхалагічная гатоўнасць асобы да рэалізацыі сваіх функцый як грамадзяніна ў вобласці нацыянальнай культуры і за яе межамі.

Сацыяльны вопыт, нормы паводзін, сістэма прынятых народам сродкаў і метадаў выхавання перадаваліся з пакалення ў пакаленне і засвоіліся як маральныя, эстэтычныя, сацыяльныя ідэалы. Неабходна падрабязна спыніцца на змесце паняцця “патрыятызм”. Слоўнік вызначае паняцце “ **патрыятызм**” як маральны і палітычны прынцып, змест якога – любоў да ўсяго айчыннага, ад мясцовасці, дзе чалавек нарадзіўся , яго народа, мовы, культуры і да дзяржавы, грамадзянінам якой ён з’яўляецца.

Даследчык В. М. Савіцкі вылучыў яго асноўныя часткі [2, С.24].

Патрыятызм уключае ў сябе, па-першае, прыхільнасць традыцыям бацькоў, продкаў, павагу да веры, звычаяў, каштоўнасцей свайго народа, прызнанне “свайго” і непрызнанне “чужога”. Патрыятызм ёсць, такім чынам, форма сувязі часоў, спосаб самавызначэння індывіда ў чарадзе пакаленняў. Гэта таксама разуменне таго, да якога роду ты належыш.

Па- другое, патрыятызм прадугледжвае любоў да сваёй зямлі, маральнае стаўленне да яе, якое выяўляецца ў працы і беражлівых адносінах, у захаванні і абароне.

Па-трэцяе, патрыятызм – гэта ўсведамленне Радзімы як ідэальнага канцэпту, сакральна-свяшчэннай сутнасці, маральнага ідэалу; рэлігійнае служэнне Радзіме як ідэі, якая сімвалізуе вышэйшы трансцэндэнтны сэнс чалавечага жыцця – вернасць Радзіме.

Па- чацвёртае, патрыятызм – служэнне дзяржаве. У гэтым сэнсе ён прадугледжвае прызнанне дзяржаўнай улады, любоў да сацыяльна-палітычнага ладу краіны, клопат пра інтарэсы і гістарычны лёс яе, гатоўнасць дзеля краіны на самаахвяраванне, гонар за сацыяльныя і культурныя дасягненні сваёй дзяржавы.

Аналіз многіх даследаванняў дае падставу сцвярджаць, што асноўнымі кампанентамі патрыятызму з’яўляюцца: духоуны, эмацыянальна-пачуццёвы і практыка- дзейсны.

Такім чынам, патрыятызм – значная каштоўнасць, якая прысутнічае ва ўсіх сферах жыцця грамадства і дзяржавы. Ён з’яўляецца важнейшым духоўным набыткам асобы, характарызуе вышэйшы узровень яе развіцця і ўнутранай дзейнасці на карысць Радзімы.

Сучасная трактоўка дадзеных паняццяў істотна адрозніваецца ад уяўленняў аб сутнасці грамадзяніна і патрыёта ў 20 стагоддзі. Калі ў савецкі перыяд акцэнт рабіўся на падпарадкаванне асабістых інтарэсаў дзяржаўным, то сёння ставіцца іншая задача - выхоўваць грамадзяніна свету і патрыёта сваёй Радзімы, што захоўваў нацыянальныя карані, здольнага да самарэалізацыі ва ўмовах шматнацыянальнага і шматканфесіяльнага свету. Мэты і задачы грамадзянска-патрыятычнага выхавання блізкія ідэям і прынцыпам педагогікі свету. Яны закліканы выхоўваць у падрастаючага пакалення міратворчае мысленне, ненасільны стыль паводзінаў, гатоўнасць жыць і працаваць у грамадстве.

Важнае значэнне ў фарміраванні нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў, на думку вучоных, мае **краязнаўчая работа**. Менавіта краязнаўства з'яўляецца адным з асноўных напрамкаў дзейнасці патрыятычнага клуба " Нашчадкі". Сёння задачы павышэння ролі літаратуры ў выхаванні маладога пакалення патрабуюць выкарыстання ўсіх відаў і форм работы, у тым ліку і літаратурнага краязнаўства [3, с. 79]. Праз клубную дзейнасць навучэнцаў можна, на нашу думку, найбольш поўна рэалізаваць мэты і задачы грамадска-патрыятычнага выхавання. Карысць літаратурнага краязнаўства заключаецца ў тым, што яно, пашыраючы і ўзбагачаючы веды навучэнцаў пра родныя мясціны, прывівае ім любоў і павагу да гісторыі культуры, дапамагае больш поўна адчуць і ўсвядоміць сувязь літаратуры з жыццём. Акрамя таго "вывучэнне літаратуры на аснове літаратурнага краязнаўства стварае спрыяльныя ўмовы для больш глыбокага ўсведамлення навучэнцамі мастацкай творчасці пісьменніка, садзейнічае ўвасабленню маральных ідэалаў, фарміраванню нацыянальнай свядомасці, якая заснавана тут не на нацыянальнай замкнутасці і абмежаванасці, а на ўменні бачыць перспектывы развіцця роднай літаратуры ў арганічнай сувязі з сусветным літаратурным працэсам"[4, с.29]. Сапраўдны дыялог паміж культурамі і рознымі іх суб'ектамі, як адзначае М. П. Жыгалава, стаў магчымы толькі ў 20 ст, калі ўжо ні адна культура не магла прэцендаваць на захоп усёй культурнай прасторы [5.с.98].

Прыгажосць Беларусі, помнікі гісторыі і культуры, знаёмства з вуснай народнай творчасцю, сустрэчы з удзельнікамі падзей, старажыламі – усё гэта фарміруе ў навучэнцаў любоў да роднай зямлі. Набытыя веды аб родным краі стануць грунтоўным падмуркам у фарміраванні пачуцця патрыятызму, нацыянальнай годнасці і адданасці сваёй Радзіме.

Працягласць работы над вопытам:

Адпаведныя ўмовы, пры якіх ствараўся мой педагагічны вопыт па фарміраванню нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў, пачаліся з 2002 года. У 2002 годзе ў Жыровіцкім аграрна-тэхнічным каледжы быў створаны патрыятычны клуб «Нашчадкі». Ідэя стварэння клуба нарадзілася ў прцэсе

работы прадметнага гуртка «Роднае слова» пры кабінеце «Беларускай мовы і літаратуры», якім я загадваю з 1999 года. На той час перад членамі гуртка стаяла галоўная задача – сабраць этаграфічны матэрыял для музея.Работа па збору экспанатаў для этнаграфічнага музея на той час ужо была пачата маёй старэйшай калегай Лідзіяй Архіпаўнай Рыжанковай, якая загадвала кабінетам беларускай мовы і літаратуры да 1999года. Збіраць экспанаты для будучага музея вельмі захапляла навучэнцаў, прывівала ім цікавасць да жыцця і быту нашых продкаў. Паступова ў іх нараджалася захапленне звычаямі і традыцыямі беларусаў. Знаемства з этнаграфічнай спадчынай роднага краю перарасло ў знаёмства з гісторыка-культурнай спадчынай Беларусі і, у першую чаргу, з зямлёй Слонімскай, дзе размешчаны Жыровіцкі аграрна-тэхнічны каледж. Накапленне матэрыялу адбывалася праз асабісты ўдзел ў рэспубліканскіх канферэнцыях. Апошнія гады члены клуба прымаюць актыўны ўдзел ў выданні альманаха «Залаты колас», у краязнаўчых віктарынах, прынялі ўдзел у раённым конкурсе “ Я люблю Беларусь”, наладжана супрацоўніцтва клуба “Нашчадкі” з гарадской бібліятэкай, пастаянна вядзецца навукова-даследчыцкая дзейнасць па вывучэнню роднага краю і яго знакамітых людзей. Работа па назапашванню матэрыялу вядзецца і па сённяшні дзень.

II. Апісанне тэхналогіі вопыту

Вядучая ідэя майго педагагічнага вопыту – абаснаваць, што нацыянальная самасвядомасць паспрыяе ўсведамленню навучэнцамі адзінства свайго краю, роднага горада, вёскі з жыццём усёй краіны, садружнасці, міравой суполкі. Для гэтага навучэнцы павінны атрымліваць новыя веды, уражанні, пазнаваць свет.

Апісанне вопыту

Сістэма развіцця нацыянальнай свядомасці прадугледжвае фарміраванне сацыяльна значных каштоўнасцей, грамадзянскасці і патрыятызму ў навучальным працэсе і пазаўрочны час.

Выхаваўчая работа па фарміраванню грамадзянскасці і патрыятызму асобы навучэнцаў у клубе “Нашчадкі” арыентавана на засваенне агульначалавечых гуманістычных каштоўнасцей, культурных і духоўных традыцый беларускага народа і ідэалогіі беларускай дзяржавы.

Асноўнымі задачамі работы патрыятычнага клуба “Нашчадкі” з’яўляецца наступнае:

1.Усю працу накіраваць на фарміраванне ў навучэнцаў нацыянальнай свядомасці і годнасці, ушанаванне традыцый народа шляхам вывучэння каляндарна-абрадавых свят, гістарычнай і культурнай спадчыны беларусаў.

2.Выхоўваць культуру пачуццяў, патрыятызм, паважлівае стаўленне да малой радзімы, да дзеячаў культуры Беларусі праз святкаванне юбілейных дат.

3. Праз дзейнасць клуба развіваць творчыя здольнасці навучэнцаў, далучаць іх да культурна-грамадкага жыцця краіны.

Такая форма дзейнасці,як клуб, здольна ахапіць навучэнцаў розных курсаў; яна дазваляе больш поўна і шырока знаёміцца не толькі са скарбамі мовы і літаратуры, але і вывучаць культуру народа ў гістарычным аспекце і як мага актыўней далучыцца да здабыткаў гэтай культуры.

Дэвізам патрыятычнага клуба "Нашчадкі" мы ўзялі словы А. Міцкевіча: " Айчына, навука, сумленне".

Значную ролю ў рабоце клуба адыгрывае яго савет, які ўзначальвае Старшыня - звычайны навучэнец, актыўны, творчы, патрыятычна настроены. План работы клуба састаўляецца і абмяркоўваецца ў пачатку навучальнага года на першым паседжанні. Тэмы заняткаў для першага курса рапрацоўваюцца на першы і другі семестр навучальнага года, для другога курса – на першы семестр навучальнага года. (гл. дадатак №1).

Адкрытыя мерапрыемсвы плануецца праводзіць сумесна. Работа ў клубе арганізавана па секцыях. У клубе працуюць фальклорна-этнаграфічная секцыя "Вытокі", гісторыка-літаратурная секцыя " Спадчына" і літаратурна-творчая секцыя "Васільковы небасхіл". Пры размеркаванні навучэнцаў у секцыі кіраўніком клуба абавязкова ўлічваюцца іх схільнасці, здольнасці, а таксама і іх асабістае жаданне.

Патрыятычны клуб "Нашчадкі" мае ярка выражаны нацыянальны характар, таму нельга не звярнуць увагу навучэнцаў, перш за ўсё, на народную творчасць. Як пісаў Я. Колас "Народ бязмежна багаты ў сваёй мастацкай творчасці. Вучыцеся ў народа". Выкарыстанне ў выхаваўчым працэсе беларускага фальклору мае бязмежныя магчымасці для фарміравання патрыятычных і грамадзянскіх пачуццяў у навучэнцаў, іх светапогляду, а таксама іх нацыянальнай свядомасці. Пераканана, што выхаваць асобу, патрыёта, грамадзяніна можна толькі праз далучэнне да вытокаў народнай культуры, фальклору, яго легенд і паданняў, да жывых крыніц паэзіі, трапнага беларускага слова, да той роднай спадчыны, якая засталася нам ад нашых продкаў, і якую мы павінны не толькі захаваць, але і памножыць.

На тэматычных занятках навучэнцы атрымоўваюць веды пра звычаі і традыцыі беларусаў, знаёмяцца з каляндарна-абрадавай паэзіяй, вывучаюць народныя прымаўкі і прыказкі, фразеалагізмы, афарызмы, легенды і паданні. Матэрыял, падрыхтаваны навучэнцамі, аналізуецца і сістэматызуецца. Так, напрыклад, узбагачаецца іх слоўнікавы запас новымі прыказкамі і прымаўкамі, афарызмамі пра Радзіму, працу, хлеб, сяброўства, вучэнне, прыроду і г. д. Тут выкладчыку неабходна звярнуць увагу навучэнцаў на тое, як у значэннях дадзеных лексічных адзінак адлюстраваны лепшыя маральныя якасці народа, асаблівасці яго культуры і менталітэту, народная мудрасць, яго культурныя традыцыі і звычаі.

Павышэнню цікавасці ў навучэнцаў да нацыянальных традыцый спрыяе і работа над сачыненнямі-мініяцюрамі: "Свята беларускага народнага календара", " Свята веснавога (летняга, зімовага, восеньскага) цыкла",

“Сямейная абраднасць беларусаў”. Падрыхтаваныя навучэнцамі творчыя работы зачытваюцца і абмяркоўваюцца на занятках клуба.

Таксама навучэнцы маюць магчымасць наведаць музей каледжа, дзе сабрана сотні этнаграфічных экспанатаў. Нацыянальныя ручнікі і дываны, разнастайныя вырабы з керамікі, прылады працы і прадметы быту беларусаў, нацыянальнае адзенне нашых продкаў – такім скарбам можна толькі ганарыцца, тым больш, што сабраны ён рукамі нашых навучэнцаў, у тым ліку і членамі патрыятычнага клуба “ Нашчадкі”, у розных раёнах Беларусі (гл. дадатак №2).

Члены клуба працягваюць збор этнаграфічнага матэрыялу, а ў час адкрытых паседжэнняў афармляюць этнаграфічны куток з гэтага бясцэннага скарбу ў стылі фрагмента з традыцыйнай беларускай хаткі.

Члены клуба, якія уваходзяць у гісторыка-літаратурную секцыю “Спадчына”, рыхтуюць матэрылы для заняткаў аб гісторыі роднага краю, аб яго знакамітых дзеячах.

Пакажам гэта на прыкладе адной з тэм заняткаў клуба “Нашчадкі, якая прысвечана наведванню Янкам Купалай Слоніма. . На занятках клуба мэтазгодна пазнаеміць навучэнцаў з гісторыка-біяграфічным матэрыялам, якія мы знаходзім у кнізе С. Чыгрына “Янка Купала і Слонімшчына”. Заняткі могуць быць падрыхтаваны або настаўнікам, або вучнямі. Важна тут тое, што гэты матэрыял выкліча сапраўдную цікавасць у навучэнцаў Слонімшіны, таму што падзеі, апісаныя ў кнізе, цесна звязаны з іх роднымі мясцінамі. Размову настаўнік можа пачаць са слоў, узятых у якасці эпіграфа: “Дарагому, любімаму народнаму паэту Беларусі Янку Купалу на шчыры ўспамін. Удзячны Сяргей Новік (Сяргей Пяюн) , г. Слонім, 14.11.1939г.” Затым настаўніку для актуалізацыі ведаў навучэнцаў мэтазгодна задаць пытанне аб тым, чаму ў нашым г. Слоніме адна із вуліц носіць яго імя? Паля разважанняў над пытаннем навучэнцы даведаюцца, што вяртаючыся з народнага сходу Заходняй Беларусі па дарозе з Беластока ў Мінск, Янка Купала 14 лістапада 1939 года заехаў у Слонім, каб сустрэцца там з Гальяшом Леўчыкам. Сапраўдную цікавасць выкліча і энсцэніроўка драматычнага ўрыўка аб сустрэчы вялікага беларускага мастака слова з Гальяшом Леўчыкам і Сяргеем Новікам, якую неабходна падрыхтаваць загадзя. У навучэнцаў з’явіцца жаданне пазнаеміцца з Гальяшом Леўчыкам, а таксама даведацца, хто такі Сяргей Новік. Пра Гальяша Леўчыка яны раскажуць у сваім паведамленні. Таксама настаўніку неабходна адзначыць, што з імем Янка Купала звязана самая старэйшая бібліятэка ў вёсцы Вялікая Кракотка на Слонімшчыне і што гэта першая ўстанова культуры ў Беларусі, якой у 1927 годзе прысвоена імя Янкі Купалы. Далей навучэнцам карысна будзе даведацца, што ў гэтай бібліятэцы два разы пабывала жонка Янкі Купала Уладзіслава Францаўна Луцэвіч, якая шмат дапамагала ўстанове.

Жывучы ў сталіцы, яна амаль кожны месяц прысылала ў бібліятэку пісьмы, бандэролі і пасылкі з кнігамі і альбомамі. Дзякуючы ей для бібліятэкі прыслалі свае кнігі з аўтографамі Міхась Лынкоў, Аркадзь Куляшоў, Андрэй Макаенак, а ў 1952 годзе - Якуб Колас. Таксама настаўніку неабходна сказаць, што ў 20-я гады на Слонімшчыне вельмі часта ставілася на самадзейнай сцэне славутая "Паўліна" Янкі Купалы. А праз амаль сорак гадоў кожны свой сезон ужо Слонімскі народный театр пачынаў менавіта з гэтага спектакля.Пасля праслуханага матэрыялу выкладчыку важна спытаць у навучэнцаў, што яны адчувалі, калі знаеміліся з новымі старонкамі біяграфіі Янкі Купалы. Навучэнцы заўважылі, што прапанаваны краязнаўчы матэрыял выклікае пачуццё гонару за Слонімшчыну. Закончыць заняткі можна чытаннем верша Г.Леўчыка, які ен прысвяціў Янку Купалу. Такім чынам, на занятках навучэнцы пазнаёмяцца з тымі літаратурнымі старонкамі, якія заўседы выклікалі пачуцці нацыянальнага гонару за свой край. Да заняткаў таксама можна падрыхтаваць вершы слонімскіх паэтаў пра Янку Купалу, такія як "Памяці Янкі Купалы" Валянціна Таўлая, "Вялікая Кракотка" Міколы Арочкі, "На вуліцы Янкі Купалы ў Слоніме" Алега Лойкі, " У Вязынцы светлай і блізкай" С.Чыгрына. Заняткі могуць быць праведзены ў форме вуснага часопіса, кожная старонка якога па свайму зместу будзе ўяўляць своеасаблівы экскурс у гісторыю літаратурнай Слонімшчыны і пазнаеміць навучэнцаў з багаццем літаратурных традыцый роднага краю, што, безумоўна, не можа не паўплываць на іх нацыянальную свядомасць.

Жыровіцкі каледж размешчаны на Слонімскай зямлі, якая багата літаратурнымі традыцыямі. Патрыятычны клуб "Нашчадкі" падтрымлівае цесную сувязь з гарадской бібліятэкай. Яго члены неаднаразова прымалі ўдзел у раённых мерапрыемствах, прысвечаных творчасці паэтаў-землякоў і грамадскіх дзеячаў Слонімшчыны. Члены клуба "Нашчадкі" з'яўляюцца пастаяннымі наведвальнікамі музея кнігі "Літаратурная Гродзеншчына". Незабыўнымі сталі мерапрыемсвы, прысвечанае юбілеям паэтаў А. Лойкі і Зьніча, а таксама юбілею грамадскага дзеяча Слонімшчыны ў часы Заходняй Беларусі Паўла Крынчыка, якія праводзіліся гарадской бібліятэкай.

У клубе "Нашчадкі" наладжана цесная сувязь з літаб'яднаннем "Крэсіва", якое існуе пры Жыровіцкім манастыры, а яго кіраўнік паэт Зьніч (манах Іаан) з'яўляецца пастаянным удзельнікам адкрытых паседжанняў клуба.

Важнае значэнне клубнай работы заключаецца ў тым, што яна дае магчымасць навучэнцам знаёміцца з яркімі, разумнымі таленавітымі людзмі, паслухаць іх прыгожую вобразную мову, насычаную цікавымі прыкладамі, з дакладнымі лагічнымі вывадамі, што гучыць з жывых вуснаў больш

даходліва і пераканальна. Навучэнцы слухаюць, а значыць, успрымаюць, адначасова яны бачаць выступаючага, бачаць яго міміку, жэсты, бачаць, як мяняецца выраз яго вачэй. Усё гэта ўзмацняе і абвастрае ўспрыманне. Іменна так праходзяць сустрэчы, арганізаваныя клубам "Нашчадкі" з паэтам Зьнічом.

Неабходна адзначыць, што сустрэчы з пісьменнікам патрабуюць пэўнай падрыхтоўкі. Чым болей навучэнцы даведаюцца пра жыццё і творчасць пісьменніка, тым большым стане інтарэс да яго асобы і кніг. На паседжанні клуба з дапамогай выкладчыка ідзе знаёмства з біяграфіяй Зьніча, з яго кнігамі, прадумваюцца пытанні, якія можна будзе задаць паэту, навучэнцы атрымоўваюць заданне вывучыць на памяць вершы, якія будуць па-мастацку прадстаўлены імі на адкрытым паседжанні. Разам з тым на чарговым паседжанні клуба ідзе падбор кніг аўтара для выставы, афармляецца сценгазета, падбіраецца матэрыял для напісання плакатаў, якія прысвечаны творчасці госця. Вялікае эмацыянальна-эстэтычнае ўздзеянне атрымоўваюць навучэнцы як ад асабістага ўдзелу ў падрыхтоўцы сустрэчы з паэтам, так ад сустрэчы з ім самім. І галоўнае, безумоўна, у тым, што змест свята – гэта паэзія, літаратура, што ўспрымаецца тут навуцэнцамі з выключнай эфектыўнасцю. Да таго ж фільм " Поэма веры" пра жыццё і творчасць Зьніча, прагляд якога звычайна ўключаецца ў план мерапрыемства, павышае ў навучэнцаў цікавасць да асобы паэта і ўзбагачае іх новымі ведамі.

Клубная работа вызначаецца яе масавасцю, і калі на сустрэчу ў Жыровіцкі каледж запрашаецца паэт Зьніч, адкрытыя паседжанні праходзяць з удзелам цэлых курсаў (актавая зала змяшчае да 300 чалавек).

Неабходна адзначыць, што глыбокія ўраджанні ад сустрэчы з паэтам адкладываюцца надоўга. Часам адразу іх бывае цяжка ўсвядоміць і выразіць, яны праяўляюцца потым, праз месяцы і гады, і адыгрываюць значную ролю ў жыцці чалавека і ў яго свядомасці. Яны абуджаюць пачуццё веры ў чалавека, у яго маральныя і духоўныя якасці. (гл. дадатак №3).

Неад'емнай часткай работы клуба "Нашчадкі" з'яўляецца правязенне экскурсій, асноўная мэта якіх – збор матэрыялу пра пісьменніка, знаёмства з мясцінамі, звязанымі з яго жыццём і творчасцю, а таксама знаёмства з гістарычным і культурным наследдзем роднага краю.

Прыкладам можа служыць экскурсія на радзіму А. Міцкевіча па маршруту: Слонім - Казлоўшчына – Дзятлава – Навагрудак – х. Завоссе – в. Свіцязь – лагер смерці часоў Вялікай Айчыннай вайны Калдычава – Слонім. Навучэнцы наведалі дом-музей А. Міцкевіча ў Навагрудку, падняліся на курган, насыпаны ў гонар паэта, пабывалі на развалінах Навагрудскага замка, здзейснілі экскурсію на хутар Завоссе, дзе нарадзіўся паэт, а таксама палюбаваліся чысцінёй і прыгажосцю возера Свіцязь. Падводзячы вынікі экскурсіі, яе ўдзельнікі падрыхтавалі паведамленні, даклады, вершы, былі выпушчаны тры тэматычныя сценгазеты, альбом. Своеасаблівым вынікам экскурсіі на радзіму А. Міцкевіча стала адкрытае паседжанне- справаздача, якое прайшло ў форме вечарыны, прысвечанай жыццю і творчасці паэта. Да

мерапрыемства рукамі навучэнцаў клуба быў зроблены макет дома, дзе нарадзіўся А. Міцкевіч (гл. дадатак № 4).

Незабыўныя ўражанні і вялікую карысць атрымалі навучэнцы і ад экскурсіі ў маляўнічы куточак Слонімшчыны, на бераг ракі Шчары, дзе паміж вёскамі Парэчча і Задвор'е размешчаны ўнікальны помнік архітэктурнага дойлідства 19 стагоддзя - каменная царква. Экскурсія была запланавана якраз на дзень правядзення 150-гадовага юбілею храма (гл. дадатак №5). Яе асноўнай мэтай стала знаёмства з родным краем і далучэнне навучэнцаў да духоўных традыцый свайго народа. Члены клуба "Нашчадкі" прынялі ўдзел у святочным багаслужэнні, пазнаёміліся з гісторыяй існавання храма, а таксама паслухалі канцэрт на хрысціянскую тэматыку. Вынікі экскурсіі былі падведзены на чарговым паседжанні клуба.

Адной з задач патрыятычнага клуба "Нашчадкі" з'яўляецца выхаванне культуры пачуццяў, патрыятызму праз святкавнне юбілейных дат знакамітых здеячаў беларускай культуры і літаратуры. Прыкладам можа служыць адкрытае паседжанне, прысваечанае 125-годдзю М. Багдановіча. Да адкрытага мерапрыемства была выпушчана сценгазета, падрыхтавана кніжная выстава, афармлены этнаграфічны куток, падабраны для прагляду відэяфільм пра жыццё і творчасць паэта; навучэнцы прачыталі на памяць вершы; пра значэнне творчасці М. Багдановіча распавядала работнік бібліятэкі каледжа С. В. Пятліцкая – усё гэта не толькі ажывіла ўяўленне пра асобу паэта, але і пасадзейнічала больш глыбокаму замацаванню ведаў пра яго жыццёвы і творчы лёс і пра шматграннасць яго таленту, закранула лепшыя маральныя якасці навучэнцаў.(Дадатак №6.1, №6.2).

Навучэнцы, якія займаюцца ў секцыях, з задавальненнем знаходзяць і рыхтуюць матэрыял для пасяджэнняў, больш чытаюць, падаржнічаюць, многія з іх пішуць вершы і прымаюць актыўны удзел у конкурсах мастацкага чытання твораў, у правядзенні дэкады камісіі дысцыплін грамдска-гуманітарнага цыкла, афармляюць альбомы, пішуць творчыя работы. Вершы членаў патрыятычнага клуба "Нашчадкі" ўжо не першы год друкуюцца ў рэспубліканскім альманаху " Залаты колас".

Найбольш запамінальнымі за апошнія гады работы клуба сталі такія мерапрыемствы, як экскурсія на радзіму А. Міцкевіча, адкрытае мерапрыемства, прысвечанае юбілею паэта Зьніча (манаха Іаана) з удзелам самога аўтара; удзел членаў клуба ў раённым конкурсе " Я люблю Беларусь", дзе каманда навуэнцаў заняла другое месца (гл.дадатак № 7); адкрытае пасяджэнне, прысвечанае юбілею М. Багдановіча пад назвай "Незгасальная зорка паэта"; удзел у мерапрыемстве, прысвечаным юбілею слонімскага паэта А. Лойкі, якое адбывалася ў гарадской бібліятэцы, і многія іншыя мерапрыемствы.

Аб'ектамі пазнавальнай і развіваючай дзейнасці членаў клуба "Нашчадкі" з'яўляюцца: музей этнаграфіі і гісторыі каледжа, бібліятэка каледжа, Дом культуры каледжа, музеі горада і раёна, РДК, Жыровіцкая семінарыя, кінатэатры горада, гурткі, спартыўныя секцыі, псіхалагічны цэнтр.

Вынікавасць і эфектыўнасць вопыту

Выкарыстанне багатага краязнаўчага матэрыялу ў працэсе рабоцы патрыятычнага клуба “ Нашчадкі” садзейнічае фарміраванню нацыянальнай свядомасці ў навучэнцаў, любові да Радзімы. Сведчаннем таму з’яўляецца павышаная цікавасць навучэнцаў да гістарыка-літаратурнай і культурнай спадчыны роднага краю, іх актыўны ўдзел у літаратурным краязнаўстве, іх творчая дзейнасць, іх удзел у разнастайных грамадскіх мерапрыемствах. Вопыт пазакласнай дзейнасці патрыятычнага клуба “Нашчадкі” паказвае, што найбольшую цікавасць у навучэнцаў выклікаюць такія формы работы, як жывыя сустрэчы з цікавымі людзьмі, экскурсіі, а таксама творчыя заданні. Вынікі праведзеных апытванняў паказалі, што работа ў клубе значна пашырыла кругаагляд навучэнцаў і павялічыла іх веды аб гісторыі і культуры роднага краю, што, безумоўна, не можа не паўплываць на фарміраванне нацыянальнай свядомасці навучэнцаў (гл.дадатак № 8).

III. Заключэнне

У нашай дзяржаве фарміраванне нацыянальнай свядомасці , любові да Радзімы з’яўляецца адной з самых важных праблем выхавання падрастаючага пакалення. Любая дзяржава, якая сапраўды зацікаўлена ў сваім далейшым існаванні і развіцці, павінна клапаціцца аб тым, каб большасць яе грамадзян не толькі прымалі яе ідэі, прынцыпы і нормы, але і ўсведамлялі сваю прыналежнасць да роднай зямлі, да яе жыватворных вытокаў, каб не толькі ведалі і ганарыліся тым бясцэнным культурным скарбам, які дастаўся нам ад нашых продкаў, але і маглі зберагчы і перадаць яго сваім нашчадкам. Таму для мяне, як для выкладчыка роднай мовы і літаратуры, праблема фарміравання нацыянальнай свядомасці як неад’емнай часткі патрыятызму і грамадзянскасці з’яўляецца асновай маёй педагагічнай дзейнасці.

Пазакласная работа, якая вядзецца клубам “ Нашчадкі”, садзейнічае выхаванню лепшых маральных якасцей навучэнцаў, значна пашыраючы магчымасці літаратурнай адукацыі, прывівае ім любоў да Радзімы, разам з тым фарміруючы сапраўдных патрыётаў і грамадзян сваёй краіны.

Па тэме дадзенага педагагічнага вопыту аўтарам былі падрыхтаваны навуковыя артыкулы: “ Літаратурнае краязнаўства як эфектыўны сродак фарміравання нацыянальнай свядомасці (Купала і Слонімшчына)” , “Выкарыстанне матэрыялаў літаратурнага краязнаўства Слонімшчыны на пазакласных занятках па літаратуры (На прыкладзе творчай асобы Плакіда Янкоўскага)”, “ Рэалізацыя камунікатыўнага і асабовага прынцыпаў пры вывучэнні літаратуры шляхам увядзення новых тэхналогій”. Дадзеныя артыкулы былі прачытаны аўтарам на навуковых канферэнцыях “ Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў сярэдняй і

вышэйшай школах” , “ Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ”і змешчаны ў зборніках матэрыялаў рэспубліканскіх навуковых канферэнцый (гл. дадатак №9). У названых вышэй артыкулах разглядаюцца псіхолага- тэхналагічныя аспекты фарміравання нацыянальнай свядомасці навучэнцаў на аснове літаратурнага краязнаўства, а таксама шляхам увядзення ў адукацыйны працэс новых тэхналогій навучання.

Дадзены педагагічны вопыт можна рэкамендаваць настаўнікам агульнаадукацыйных школ, гімназій, выкладчыкам ліцэяў, каледжаў.

Літаратура:

1. Закон Рэспублікі Беларусь 5 чэрвеня 2006 г. №141-3. Аб сярэдняй адука
2. Савіцкі, У. М. Нацыянальная культура як крыніца патрыятызму / У. М. Савіцкі// Ідэалагічныя аспекты ваеннай бяспекі Рэспублікі Беларусь. - 2011.- 3. С. 23-29
3. Корнейчик, Л. В. Использование материалов литературного краеведения Слонимщины на внеклассных занятиях (На примере творческой личности Плакида Янковского) / Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ: матэрыялы рэсп. навук. кан. Брэст, 28-29 сакавіка 2008 года/ Брэст: «Альтернатива», 2008 г.- с. – 79
4. Жигалова, М. П. Использование материалов литературного краеведения в курсе русской литературы при изучении славянских авторов в белорусской школе: метод. рек. в помощь учителю / М. П. Жигалова; Брестский областной Институт усовершенствования учителей. – Брест, 1994. –29с.
5. Жигалова, М. П.Культурологический анализ. В кн. Интерпретация и анализ в лит-ре: теория и практика: монография, М. П. Жигалова; Брест. гос. ун - т имени А. С. Пушкина. – 2-е изд., доп. – Брест: БрГУ, 2011.- 269 с.- С.98

Дадатак№1

Каляндарна- тэматычны план работы работы патрыятычнага клуба “Насчадкі” на 2016-2017 год (Выпіска з журнала работы клуба)

№ заняткаў	Дата	Змест заняткаў (1курс)
1	05. 09.	Арганізацыйнае паседжанне клуба. Планаванне работы.

2	19.09.	Знаёмства з экспанатамі музея каледжа. Экскурсія па этнаграфічнаму аддзелу.
3	03. 10.	Каляндарна-абрадавая паэзія беларусаў. Прыказкі, прымаўкі. Легенды і паданні пра Беларусь.
4	17.10.	“ Любімае народнае свята нашай сям’і”. (Абмеркаванне сачыненняў-разважанняў навучэнцаў).
5	14.11.	Знаёмства з музеем кнігі Цэнтральнай бібліятэкі горада Слоніма “ Літаратурная Гродзеншчына”.
6	28.11.	Падрыхтоўка да святкавання юбілею М. Багдановіча.Разгляд яго творчасці, падбор матэрыялу для правядзення адкрытага мерапрыемства, выпуск сценгазеты.
7	08.12.	“Незгасальная зорка М. Багдановіча” (Адкрытае паседжанне клуба, прысвечанае 125-годдзю з дня нараджэння паэта).
8	19.12.	Архітэктурны комплекс Жыровіцкага манастыра (экскурсія)
9	16.01.	Экскурсія на Жыровіцкую крыніцу.
10.	13.02.	Сустрэча з паэтам Зьнічом (манахам Іаанам), рэдактарам багаслоўска-літаратурна-мастацкага лістка “Жыровіцкая абіцель”.
11.	27.02.	“Паэты і пісьменнікі Слонімшчыны” (Вусныя выступленні навучэнцаў).
12.	13.03.	“ Мы беларусы” (Да Дня Канстытуцыі). Сустрэча са старшынёй Сельскага Савета.
13	27.03.	Абмеркаванне сачыненняў-разважанняў на тэму “Я – малады грамадзянін Беларусі.”
14	10.04.	Я. Купала і Слонімшчына.
15	24.04.	“ Ад прадзедаў спакон вякоў мне засталася Спадчына” (Да 135-годдзя з дня нараджэння Янкі Купалы).
16	06. 05.	Экскурсія па роднаму краю (Знаёмства з помнікам

		архітэктуры 19 ст. – храмам у в. Парэчча Слонімскага раёна).
17	15.05.	14 мая -Дзень дзяржаўнай сімволікі Рэспублікі Беларусь (Гутарка).
18	23. 05.	“Значэнне азбукі Кірыла і Мефодзія для развіцця славянскай пісьменнасці. Асветніцкая дзейнасць Францыска Скарыны” (паседжанне, прысвечанае Дню славянскай пісьменнасці). Вусныя выступленні навучэнцаў.
19	20. 06.	Экскурсія на месца былой сядзібы заснавальніка Жыровіцкага манастыра А. Солтана.
		Змест заняткаў (2 курс)
1.	06.09.	Падвядзенне вынікаў работы за першы год навучання і абмеркаванне плана работы на першы семестр 2016-2017 навучальнага года.
2.	20.09.	Этнагенез беларусаў. Паходжанне паняццяў “Літва” і “Белая Русь”. Вытокі фарміравання беларускай мовы. Беларускае нацыянальнае Адраджэнне.
3.	04.10.	Знаёмства з асобай і творчай спадчынай Плакіда Янкоўскага, пісьменніка, вучонага і публіцыста 19 ст. Наведванне месца яго пахавання.
4.	18.10.	Помнікі гісторыі і культуры роднага краю (Знаёмства з унікальным помнікам абарончага дойлідства - Сынковіцкай царквой).
5.	28. 11.	Падрыхтоўка да святкавання юбілею М. Багдановіча. Падбор матэрыялу для правядзення адкрытага мерапрыемства, выпуск сценгазеты.
6.	08.12.	“Незгасальная зорка М. Багдановіча” (Адкрытае паседжанне клуба, прысвечанае 125-годдзю паэта).
7.	20.12.	Вывучэнне жыцця і навуковай спадчыны У.Сыракомлі, А. Ф. Рыпінскага, Я. Баршчэўскага, Я. Ф. Карскага. Вусныя выступленні навучэнцаў пра дзейнасць

		заснавальнікаў беларускага краязнаўства.
8.	17.01.	Падвяденне вынікаў работы за першы семестр друга курса.

Дадатак №2

Экскурсія ў этнаграфічны адзел музея каледжа

Дадатак №3

Сустрэчы з сучасным беларускім паэтам манахам Іааннам

Дадатак №4

Члены клуба “Нашчадкі” падчас экскурсіі на радзіму А. Міцкевіча. Макет дома на хутары Завоссе, зроблены навучэнцамі

Дадатак №5

Знаёмства з помнікам архітэктуры 19 ст – храмам в. Парэчча Слонімскага раёна ў дзень святкавання яго 150-годдзя

Дадатак № 6.1

План
мерапрыемства
“ Незгасальная зорка М. Багдановіча”,
прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння паэта.

Месца правядзення: актавая зала лабараторнага корпуса. Гр.: 34м, 33м, 23э.Час правядзення : 16.10.
Мэты мерапрыемства:

Навучальная – стварыць умовы для ўзнаўлення ведаў пра жыццё і творчасць М. Багдановіча;

Развіваючая – ходам мерапрыемства садзейнічаць развіццю эстэтычнага густу навучэнцаў, пачуцця нацыянальнай свядомасці;

Выхаваўчая–стварыць умовы для выхавання пачуцця патрыятызму, павагі да літаратурнай і культурнай спадчыны беларусаў, пачуцця нацыянальнай годнасці.

Абсталяванне: этнаграфічны куточак, кніжная выстава, вучэбны фільм, прысвечаны 125-годдзю творчасці паэта, мультымедыйная ўстаноўка.

Ход мерапрыемства.

1. Вытокі творчасці М. Багдановіча (Карнейчык Л. У.)
2. Мастацкае выкананне вершаў М. Багдановіча “ Па-над белым пухам вішняў” (Васілеўскі С., 24э гр.) і “ Зорка Венера” (Ерамейчык М., 24э гр.)
3. Агляд творчай спадчыны М. Багдановіча і ўшанаванне яго памяці сёння. (Пятліцкая С. В.)
4. Дэманстрацыя фільма, прысвечанага жыццю і творчасці паэта.
5. Адметнасць паэзіі М. Багдановіча (Карнейчык Л. У.)
6. Мастацкае выкананне верша М. Багдановіча “ Пагоня” (Хавустаў А., 23э гр.)
7. Заключнае слова кіраўніка клуба “ Нашчадкі”. (Карнейчык Л. У.)

Кіраўнік клуба “Нашчадкі” (Карнейчык Л. У.)

Сцэнарый мерапрыемства

Гучыць песня на верш М. Багдановіча “Слуцкія ткачыхі”. (Кліп №1). Песня абрываецца праз 1.5 хвіліны і кіраўнік клуба “ Нашчадкі” гаворыць пра вытокі творчасці М. Багдановіча.

Карнейчык Л. У.

“Гэта была яшчэ раніца, ранняя раніца, калі толькі пачынае брацца на дзень, калі яшчэ сонца недзе далёка за лясамі, але там, дзе яно будзе ўзыходзіць, ужо заружавеўся і пасвятлеў небакрай. Гэта была рання раніца маладой беларускай, што ў пачатку новага веку на змрочным небе тагачаснага грамадскага жыцця ўспыхвала і разгаралася сваімі першымі яркімі зоркамі”(Н. Гілевіч).

У гэты час і данёс на Радзіму – з далёкіх волжкіх берагоў- свой чысты і звонкі голас яшчэ нікому не вядомы паэт, паэт, з выразна акрэсленым нацыянальным складам мыслення і ўспрымання і з характэрным беларускім прозвішчам: Максім Багдановіч. Чытачы яго першых друкаваных вершаў, напэўна, былі б нямала здзіўлены, калі б ведалі, што паэту было ўсягяго сямнаццаць годоў ад роду і што з іх усяго толькі пяць першых ён пражыў на роднай беларускай зямлі. Папраўдзе кажучы, і сення здаецца неверагодным, як мог гэты хваравіты гімназіст-падлетак, адарваны ад жывой стыхіі беларускай мовы, так авалодаць ёю, каб улавіць усе найтанчэйшыя адценні слова, усе яго фарбы і колеры, і што яшчэ важней, - адчуць праз мову самую душу народа і на яе высокі і прыгожы лад настроіць сваё маладое сэрца.

Даследчыкі творчасці паэта і яго біёграфы бачаць разгадку гэтай надзвычайнай у гісторыі літаратуры з'явы ў тым, што у сям'і Багдановічаў панавала атмасфера глыбокай павагі да Бацькаўшчыны, павагі, якая перадавалася, несумненна, і дзецям; што бацька паэта Адам Ягоравіч быў выдатным беларускім вучоным-этнографам і меў багатую бібліятэку самых разнастайных кніг аб Беларусі, якімі захапіўся яшчэ ў гады дзяцінства і Максім; што менавіта гэтыя кнігі абудзілі ў ім цікавасць да роднага краю, да яго трагічнага лёсу, да яго людзей і прыроды – цікавасць, якая перарасла затым у самаахвярную любоў, у вялікую мэту ўсяго яго жыцця.

Пералічаныя акалічнасці самі па сабе не надта многа значылі бы, калі б не матацкі густ, якім быў надзелены Багдановіч ад прыроды; калі б не выключнай сілы паэтыны дар, што даецца толькі натурам цэласным і глыбокім; калі б не тонкі і праніклівы розум, што здіўляе сваёй неюнацкай спеласцю.

Давайце разам з вамі зараз паслухаем вершы М. Багдановіча, каб яшчэ раз пераканацца ў яго выключным паэтычным дары, у яго неюначай спеласці і ў яго токім мастацкім гусце. (7 хв.)

У выкананні членаў клуба " Нашчадкі" гучаць вершы " Па-над белым пухам вішняў". і "Зорка Венера". (4 хв.)

Работнік бібліятэкі Пятліцкая С. В. пра творчую спадчыну паэта. (10 хв.)

Карнейчык Л. У.

Каб бліжэй пазнаёміцца з асобаю М. Багдановіча, запрашаю ўсіх вас, шаноўныя сябры, здейсніць вертуальнае падарожжа па памятных мясцінах, звязаных з жыццём і творчасцю паэта, наведаць літаратурныя музеі Багдановіча ў Гродна, Мінску, у Ракуцёўшчыне, пабываць у Ялце, дзе прайшлі апошнія месяцы яго жыцця.

Прагляд фільма. (18 хв.)

Карнейчык Л. У.

Для мяне М. Багдановіч – прыклад чалавека, які здолеў за кароткае жыццё пакінуць вялікі след у гістарычнай памяці народа. Яго паэзія расякнута любоўю да роднага краю, да роднай мовы. У вершах М. Багдановіча гучыць вялікая павага да свайго народа, вера ў яго стваральныя сілы. Ідэя нацыянальнага Адраджэння стала мэтай і сэнсам жыцця Багдановіча, а гэта, на мой погляд,вельмі блізка і зразумела для кожнага

беларуса. Яго вершы маюць глыбокі філасофскі сэнс. Яны прымушаюць кожнага з нас паставіць перад сабою пытанне: “А што я зрабіў для роднай краіны, што я зрабіў для таго, каб родная Беларусь і найдалей жыла і квітнела?”І нам, сённяшнім беларусам, праз 100 гадоў гучыць як заклік, як напамін, як папрок, каб мы не былі чужынцамі на сваёй зямлі, каб мы не былі здраднікамі тых ідэй, дзеля якіх жыў Маіксім Багдановіч, каб мы перараслі тутэйшасць і сталі сапраўднымі беларусамі. І як па-сучаснаму сёння гучыць “Пагоня” М. Багдановіча.(1хв.)

Гучыць верш “Пагоня”.(2 хв.)
Карнейчык Л. У.

Творы сапраўднай паэзіі маюць адну адметную якасць: яны вельмі лёгка, падчас з першага разу, затрымліваюцца і надоўга застаюцца ў памяці. Большасць вершаў Багдановіча якраз і вызначаецца гэтым. Многія яго вершы – у тым ліку такія шэдэўры нацыянальнай лірыкі, як “ Зорка венера” і “Слуцкія ткачыхі”,- даўно зрабіліся папулярнымі народнымі песнямі (1хв.).

Дэманстрацыя музычнага кліпа на верш “Слуцкія паясы” .(Кліп №1, 3.45. хв.)
Заключнае слова кіраўніка клуба
Карнейчык Л. У.

Усяго дзесяць гадоў прадаўжалася творчая дзейнасць таленавітага сына беларускай зямлі. Крыўдна мала суджана было пажыць М. Багдановічу, ён адышоў яшчэ на подступах да таго, што мы звычайна называем “ росквітам творчых сіл”.Але творам, якія ён паспеў падарыць народу, выпаў зайдросны лёс: да яго неўміручых радкоў цягнуцца шчырыя вочы і сэрцы людскія.А імя паэта, па словах Ніла Гілевіча, стала адным з самых дарагіх імён у памяці ўдзячных нашчадкаў (1 хв.)

Гучыць кліп “ Зорка Венера” (2.52.хв.)

Дадатак №6.2

Падчас адкрытага паседжання клуба, прысвечанага 125-годдзю з дня нараджэння М. Багдановіча

Дадатак №7

Удзел каманды клуба “Нашчадкі” ў раённым конкурсе “Я люблю Беларусь”

Дадатак №8

Пытанні апытвання:

1. Як ты лічыш: праца ў клубе “Нашчадкі” ўплывае на твой кругаагляд ?
2. Што новага ты даведаўся аб родных мясцінах, гістарычных помніках, пісьменніках, мастаках, грамадскіх дзеячах роднага краю?
3. Якія беларускія каляндарна-абрадавыя святы адзначаюцца ў вашай мясцовасці? Назаві іх.
4. Ці дапамагаюць табе веды, атрыманыя ў клубе “Нашчадкі”, ў вывучэнні іншых дысцыплін? Назаві, якіх.
5. Якія формы правядзення заняткаў ў клубе “Нашчадкі” ты лічыш найбольш эфектыўнымі ў тваёй вучэбнай дзейнасці? Якія мерапрыемствы табе найбольш запомніліся?

Дадатак №9

Публікацыі па тэме вопыту:

Карнейчык Л. У. Рэалізацыя камунікатыўнага і асабовага прынцыпаў пры вывучэнні літаратуры шляхам увядзення новых тэхналогій / Актуальныя праблемы выкладання мовы і літаратуры ў сярэдняй і вышэйшай школе: Матэрыялы рэсп. навук. канф., 16 красавіка 2004 г., г. Гродна / Адк. рэд. У.І. Каяла. – Гродна: ГрДУ, 2004. – 366 с.

Корнейчик Л. В.Использование материалов литературного краеведения Слонимщины на внеклассных занятиях (На примере творческой личности Плакида Янковского) / Краязнаўства як адзін з накірункаў вучэбна-выхаваўчай работы ў школе і ВНУ: матэрыялы рэсп. навук. канф., Брэст 28 - 29 сак. 2008 г./ пад аг.рэд. У. А. Сенькаўца. – Брэст: Альтернатива, 2008. – 308 с.